Трэнінг па пажарнай бяспецы

У аддзяленні падтрымкі актыўнага даўгалецця ва ўмовах дзённага знаходжання Цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ашмянскага раёна адбылося мерапрыемства, якое аб'яднала пакаленні. У госці да пажылых грамадзян прыйшлі вучні 6 класа. Сустрэча прайшла ў межах рэспубліканскага праекта «Кожная пятніца-роднае, сваё!»



Галоўнай падзеяй дня стаў трэнінг па пажарнай бяспецы. Замест звычайнай лекцыі ўдзельнікаў чакала камандная гульня. Былі створаны дзве змешаныя каманды: у кожнай апынуліся і школьнікі, і бабулі. Такі фармат дапамог і дзецям, і старэйшаму пакаленню лепш зразумець адзін аднаго і разам знаходзіць правільныя рашэнні ў незвычайных сітуацыях.

Пасля актыўнай часткі ўдзельнікаў чакала прыемнае завяршэнне — дружнае чаяванне. На памяць кожны госць атрымаў значок знаўцы пажарнай бяспекі.

Сустрэча яшчэ раз падцвердзіла: сумесныя заняткі і жывое абмеркаванне робяць наш дом больш бяспечным. Калі дзеці і сталыя людзі разам вучацца правілам бяспекі, гэта збліжае пакаленні і дадае спакою кожнай сям’і.









